# НАКАЗ ТАВ. ГІКАЛО ВЫКАНАЕМ

15 лістапада адбыўся сход станкавых дрэваапрацоўчага камбіната імя Гікало сумесна з тэхнічнымі работнікамі.

Тав. Фейгін — удзельнік дэлегацыі стаханаўцаў, якіх прыняў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гікало, расказаў сходу аб сваёй гутарцы з Нікалаем Фёдаравічам.

«Я перадаў прывітанне тав. Гікало ад усіх рабочых камбіната і сказаў, што наш камбінат да гэтага часу цягнуўся ў хвасце з прычыны засмечанасці класава чуждымі трацкісцкімі элементамі. Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і Гомельскага гаркома мы ачысцілі камбінат ад класава-чуждых элементаў і разгарнулі стаханаўскі рух. Дзякуючы гэтаму мы датэрмінова выканалі гадавы план, і гэта дало нам права ісці ў першай калоне гомельскіх заводаў у час Кастрычніцкіх свят».

«Нікалай Фёдаравіч, — кажа Фейгін, — ніколі на камбінаце не быў, але ён ведае, які варштат добра працуе, які дрэнна. Нікалай Фёдаравіч папрасіў мяне перадаць прывітанне ўсім рабочым і заўважыў, што павозкі нашага камбіната надта цяжкія на хаду. Трэба рабіць іх лягчэйшымі. Я запэўніў тав Гікало, што гэта будзе зроблена і што камбінат апраўдае імя сакратара ЦК КП(б)Б».

Малады стаханавец мэблевай фабрыкі тав. Максюк расказаў, што, прачытаўшы ў газеце аб Стаханаве, ён паставіў сабе задачу стаць стаханаўцам. На работу ён пачаў выходзіць за 35 мінут да гудка. За гэты час ён прыбірае рабочае месца, прыладжвае інструмент і падрыхтоўвае матэрыял. Раней ён выконваў план на 120 проц., зараз на 307. Раней ён атрымліваў у месяц 100—150 руб., а зараз 300 рублёў.

Стаханаўцы абавязаліся дасягнуць яшчэ вышэйшых колькасных і якасных паказчыкаў.

**Сяргей ТКАЧОЎ**
**Новабеліца, камбінат імя Гікало.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ